**У.У.Трамбіцкі,** *ст. выкладчык*

# НОРМЫ І СТАНДАРТЫ ЯК СТУПЕНІ РАЗВІЦЦЯ КУЛЬТУРЫ

Існаванне нормаў і стандартаў надае актыўнасці людзей цывілізаваны характар. Справа ў тым, што нормы і стандарты дапамагаюць улічваць асаблівасці сацыяльных груп і канкрэтных асоб. Без узгаднення інтарэсаў асобы і грамадства сацыяльная актыўнасць у адных адносінах ператвараецца ў сацыяльную пасіўнасць у другіх. Дзяржава як сацыяльны інстытут займаецца кантролем за выкананнем рознымі суб'ектамі сацыяльных нормаў.

Нормы неабходныя не толькі для дзяржавы, але і для абароны інтарэсаў асобы. Яны рэгулююць прафесійныя ўзаемаадносіны, правы і абавязкі, узаемныя дачыненні рэлігіі і дзяржавы і інш. Існаванне нормаў для дзяржавы і асобы – адзнака цывілізаванасці, узроўню сацыяльнага развіцця.

На пэўным этапе развіцця грамадства наступае такі перыяд, калі неабходна перагледзець старыя і сфармуляваць новыя нормы. Гэтая тэндэнцыя сведчыць аб тым, што старыя нормы пачынаюць перашкаджаць развіццю грамадства (культуры, навукі, адукацыі і інш.). Нормы і стандарты тады выступаюць у якасці ступеней развіцця, кожная наступная норма захоўвае пазітыўныя элементы папярэдніх.

Іншая справа, калі не ўсе суб'екты грамадства прытрымліваюцца вызначаных нормаў. Тут многае залежыць ад узроўню культуры грамадства і асобы. Нормы ахоўваюць асобу ад суб'ектаў, якія свядома або несвядома ажыццяўляюць антыграмадскую дзейнасць. Адзнакай цывілізаванасці асобы і грамадства з'яўляецца спосаб, якім суб'екты сацыяльнай актыўнасці імкнуцца змяніць нормы, — эвалюцыйны або рэвалюцыйны. У некаторых выпадках змена існуючых нормаў адбываецца шляхам насілля. Насілле аўтарам наогул не адмаўляецца (спыніць насілле можна толькі насіллем, калі іншыя спосабы не аказваюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

дзейснымі). Прагрэсіўнае развіццё грамадства і асобы магчымае толькі на шляху змяншэння насілля, у ходзе пошукаў новых сацыяльных тэхналогій (у тым ліку тэхналогій навучання і выхавання), заснаваных на дасягненнях сучасных навукі, культуры.

Неабходнасць існавання індывідуальных і сацыяльных нормаў была абгрунтавана ў філасофскіх сістэмах Старажытнага Усходу. Своеасабліва гэтую праблему вырашыў З.Фрэйд, які аднёс культуру да такога элемента ў структуры псіхічнай дзейнасці чалавека, як “супер-эга”. Акрамя гэтага, ён вылучыў “Я” — свядомае і “Яно” — несвядомае. Тое, што З.Фрэйд называў “супер-эга” ў псіхічнай дзейнасці асобы, абазначала прыманне або непрыманне асобай існуючых нормаў.

У творчасці Ф.М.Дастаеўскага разгледжаная праблема выяўлена ў хістанні Раскольнікава перад выбарам: “Я стварэнне дрыжачае, ці маю права перайсці рысу”. Праўда, рыса аддзяляла Раскольнікава ад забойства, ад непрымання агульначалавечых нормаў.

Існаванне нормаў у любых формах чалавечай дзейнасці не абазначае таго, што ўсе людзі іх выконваюць. Часта асоба імкнецца выйсці за межы існуючых у грамадстве нормаў, стандартаў, правіл. Дзейнасць гістарычных асоб (вучоных, палітыкаў, мастакоў) часта выходзіла за межы гэтых нормаў. Патрэбны час для таго, каб вынаходніцтва вучонага стала нормай для большасці грамадзян. Прыкладаў таму шмат: электрычнасць, радыё, вылічальная тэхніка і інш. Зусім іншая справа тады, калі размова ідзе пра асобу з псіхічнымі адхіленнямі ад нормаў. Такога кшталту выпадкамі павінны займацца не сацыёлагі, а псіхолагі і медыцынскія супрацоўнікі.

Бывае і так, што акрэсліць мяжу, за якой асоба становіцца сацыяльна небяспечнай, вельмі не проста.

Нормы ў грамадстве ствараюць умовы развіцця асобы і культуры. Асоба жыве і дзейнічае ў сацыяльным асяроддзі, яна ўлічвае дзеянні іншых асоб, сацыяльных інстытутаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(дзяржавы з яе нормамі права, маралі, рэлігіі і інш.). Нормы нівеліруюць крайні індывідуалізм і эгаізм асобы, робяць яе сацыяльнай. Яны з'яўляюцца як бы кампрамісам паміж асобай і грамадствам (не здымаючы пры гэтым супярэчнасці паміж інтарэсамі апошніх). Асоба выпрацоўвае сістэму адказаў на патрабаванні сацыяльных інстытутаў, выбірае шляхі вырашэння праблем разам з іншымі асобамі, сацыяльнымі інстытутамі. Выбар сродкаў, метадаў і прыёмаў, пры дапамозе якіх асоба ўзаемадзейнічае з навакольным светам, належыць асобе. Ён можа быць зроблены на карысць навукі, мастацтва, рэлігіі, палітыкі і інш.

Гістарычныя асобы могуць змяніць погляд грамадства на існуючыя нормы і тэорыі, нават садзейнічаць іх карэннаму перагляду ў шмат якіх галінах навукі (у фізіцы, хіміі, біялогіі і інш.). У гэтым выпадку адхіленне ад нормаў у дзейнасці знакамітасцей вядзе да росту ведаў. Асобы такога тыпу садзейнічаюць перагляду старых і фармулёўцы новых тэорый, нормаў і стандартаў, якія ўжо больш адэкватна адлюстроўваюць заканамернасці прыроды і грамадства. Такога кшталту "рэвалюцыйную" дзейнасць не трэба блытаць з бунтам асобы.

Выказаныя развагі маюць дачыненне да праграм па ўсіх навучальных дысцыплінах. Грамадства ў працэсе развіцця змяняе патрабаванні да вучэбных праграм, што выступаюць у якасці нормаў.

Нормы і стандарты можна разглядаць як ступені ў развіцці адукацыі. У сувязі з узнікненнем новых формаў і тэхналогій у адукацыі, новых мадэлей у галінах мастацтва і культуралогіі распрацоўка новых адукацыйных нормаў набывае асаблівую актуальнасць. Змена адукацыйных нормаў адбываецца пры фарміраванні грамадскіх і сацыяльных каштоўнасцей. Некрытычны перанос новых нормаў і стандартаў у розныя галіны дзейнасці можа адмоўна паўплываць як на працэс навучання, так і на грамадскае жыццё. Новыя праграмы па культуралогіі, мастацкіх дысцыплінах павінны ўлічваць самабытнасць нацыянальных

культуры, традыцый, менталітэту. Акрамя таго, новыя нормы і стандарты здольныя павысіць якасць адукацыі.

Філасофскія разважанні аб узаемадзеянні старых і новых стандартаў, традыцыйных і новых нормаў дзейнасці могуць выступаць у якасці метадалагічных і светапоглядных арыенціраў.

**Н.М.Хадзінская,** *дацэнт*

## ВЫВУЧЭННЕ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫКІ Ў СІСТЭМЕ МУЗЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ВНУ

Адно з галоўных месцаў у сістэме музычнай адукацыі Беларускага універсітэта культуры, іншых вышэйшых навучальных устаноў мастацтва займаюць цыклы музычна-тэарэтычных і музычна-гістарычных дысцыплін. Традыцыйнай з'яўляецца арыентацыя ў праграмах гэтых дысцыплін на класічную і (праўда, вельмі абмежавана) сучасную музыку. Гэта абумоўлена наяўнасцю вялікай колькасці крыніц інфармацыі аб музыцы мінулага і той часавай аддаленасцю, якая дае магчымасць зрабіць тэарэтычныя абагульненні па пытаннях стылявых накірункаў, кампазітарскіх тэхнік, іншых з'яў музычнага мастацтва.

Пашырэнне часавых межаў, уключэнне ў курсы гісторыі музыкі, аналізу музычных твораў, гармоніі, паліфаніі матэрыялаў па беларускай музычнай творчасці другой паловы — канца XX ст. — неабходная ўмова выхавання сапраўды сучаснага, рознабакова адукаванага спецыяліста, будучага інтэрпрэтатара і прапагандыста музыкі нашых дзён.

На шляху вырашэння гэтай найважнейшай педагагічнай задачы паўстае такая перашкода, як амаль поўная адсутнасць навуковай літаратуры, якая змяшчала б назіранні, апісанні, тэарэтычны аналіз твораў беларускіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ